11

# МАЛАДОСЦЬ

- **НОВЫЯ ВЕРШЫ** ПІМЕНА ПАНЧАНКІ
- **СТРЭЛ У СУДЗЕ —** ПОДЗВІГ С. ПРЫТЫЦКАГА
- **ГАРАЧАЯ КЛАДКА —** РАСКАЗ ПРА БУДАЎНІКОЎ
- **КОЛАСАЎЦЫ —** 50 ГОД ТЭАТРУ






**Ніл ГІЛЕВІЧ. АКТАВЫ. Вершы. Выдавецтва «Мастацкая літаратура»,** Мінск, 1976 г.

# МАТЭРЫЯ ПАЧУЦЦЯ

Новы зборнік Ніла Гілевіча «Актавы» ўжо ў загалоўку носіць прыкмету мастацкага эксперымента: ад актавы як класічнай страфы аўтар узяў толькі адну фармальную прыкмету—восем радкоў, пакідаючы сабе свабоду рытміка-інтанацыйных рашэнняў. У кніжцы пазнаеш тэксты, якія ў папярэднім зборніку «А дзе ж тая крынічанька» складалі асобны раздзел—«Элегіі неэлегічных дзён». Значыць, акрамя васьмірадковай страфы, вершы гэтыя аб'ядноўвае і агульны настрой. Праўда, ранейшыя тэксты—толькі «закваска» ў новым зборніку. Твар яго вызначаюць рэчы новыя або перапрацаваныя, на гэта ўказваюць двайныя даты пасля тэксту.

Зборнік Гілевіча, напэўна, зацікавіць паэтаў формай, а шчырых чытачоў, якія маюць права не заўважаць тонкасцяў рамяства,—зместам, важкасцю яго.

Асноўнае прызначэнне формы мастацкага твора—быць эстэтычнаю рэальнасцю ідэі, яе матэрыяй, увасабленнем яе сілы, яе здольнасці завалодаць душой чытача. Нярэдка літаратурная мода прыпісвае абсалютную перавагу пэўным мастацкім формам, напрыклад, асацыятыўным метафарам, медытацыйным ці спавядальным інтанацыям, нібыта яны заўсёды могуць даць максімум эстэтычнага эфекту. Гаварыць пра эфектыўнасць вобразных сродкаў ці кампазіцыйных прыёмаў незалежна ад канкрэтнай творчай задачы рызыкоўна. Кожны творчы акт мае свае мажлівасці і свае межы кандэнсацыі пачуцця і думкі ў слове-вобразе, а выбар, адкрыццё вобраза—у руках мастака. Нельга лічыць, быццам ужыты паэтам канкрэтны спосаб вобразнага вырашэння ідэі ў канкрэтным творы з'яўляецца абсалютна дасканалым і адзіна мажлівым. У мастацтве няма межаў дасканаласці, як няма межаў сіле ўроджанага творчага дару і межаў дасканалення мастацтва як сістэмы. Чым большы талент у мастака, тым большае багацце формаў падуладна яму, чым вышэй развіццё мастацтва ў краіне і свеце, тым большая будзе патрэба арыгінальнасці формы ў чытача. Тут спецыфіка мастацтва з яго персаніфікаванасцю эстэтычнай праўды-сумлення і праўды-красы. Толькі навуковыя ісціны носяць універсальны характар і афармляюцца аднолькава, а мастацкая ісціна заўжды чалавечая, падкрэслена асабовая, індывідуальная, чыясьці.

«Актавы» Гілевіча пачынаюцца заяўкаю на партнёрства паэтаў з вучонымі-фізікамі ў справе ўладкавання свету. І тут не якісь жэст паэтычнай дзёрзкасці. У эпоху навукова-тэхнічнай рэвалюцыі паэзія сапраўды свядома і настойліва ўдзельнічае ў тварэнні аблічча сучаснасці, у прагназаванні будучыні, паддаючы гуманістычнай праверцы вялікія навуковыя адкрыцці і тэхнічныя вынаходніцтвы веку. Права на гэта дае паэтам усведамленне, што навука і тэхніка прызваны служыць чалавеку, а па вастрыні адчування чалавечых патрэб паэзія мае свае неаспрэчныя перавагі. Вялікі Гамер, хоць жыў у эпоху, якая не ведала механічных коней, зрабіў геніяльныя адкрыцці ў сферы чалавечых адносін, уславіў чалавека, здольнага адкрываць, змагацца, перамагаць. Прыклад Гамера хвалюе, але і непакоіць: можа стацца і наадварот—у эпоху тэлевізараў, спадарожнікаў Зямлі і электронных робатаў паэты не створаць чагосьці вялікага, не забяспечаць гуманістычнага фронту ў поступе часу. Ніл Гілевіч хоча, каб сучасны паэт быў на ўзроўні фізіка-атамніка, каб мог «шляхам атамнага расшчаплення прывесці ў рух энергію сумлення».

Гілевіча моцна хвалюе праблема спадчыны. Прыхільнік прагрэсу, ён заклапочана пытае сябе і іншых: а ці не губляем мы часам чагосьці каштоўнага, аддаючыся ва ўладу касмічных хуткасцяў веку? Паэт хоча, каб духоўная спадчына не адмаўлялася сучаснасцю, а дыялектычна «здымалася», г. зн., каб засвойвалася і развівалася ў новых, сучасных умовах і ажывала ў новых формах. Сучаснасць і традыцыя—не антыном, а два члены дыялектычнай сістэмы. Выпадзенне аднаго з іх абавязкова парушыць деялектычную раўнавагу і прывядзе да амярцвення духоўнага поля жыцця:

Адну надзею толькі ў сэрцы маю
(Пра гэта скажа нехта, як пра грэх),
Што родны край і праз вякі пазнаю
Па песні матчынай... Я—за прагрэс.

Заглыбленая, не гаманлівая, але настойлівая спрэчка з гэтым «нехта» адчуваецца ва ўсім зборніку, яна становіцца скразною ўнутранаю тэмай яго. Пахвальна, што лірычны герой, за нямногімі выключэннямі, не выходзіць з рамак паважнага, не раняе сябе ў вачах апанента і чытача. Яго думка лунае высока, словы гучаць прачула і ўдумліва, гаворка нават у самых драматычных мясцінах застаецца ўрачыста-нятлумнай. Палёт на арбіце натхнення не стамляе душы, ён толькі павышае нормы духоўнай жыццядзейнасці. Паэт не пярэчыць сабе, калі ў іншым вершы гаворыць:

Вечна спяшаемся, вечна няма нам калі:
Пешшу даўно ўжо не ходзім па грэшнай зямлі.
Як на пажар усё роўна, нас колы нясуць
Міма бяроз на пагорку—цнатлівых красунь,
Міма крынічкі, што ціха з-пад каменя б'е,
Міма салоўкі, што ў кусце альховым пяе...

Акрамя царства прыроды, яе гаючага хараства, ёсць яшчэ адно царства, міма якога сучасніку нельга прамчацца ў тлумным бегу дзён—гэта царства духоўных каштоўнасцяў, створаных народам за вякі. Паэт дзеліцца як найвялікшымі адкрыццямі тымі ўражаннямі, што вынес ён ад сустрэч з вясковымі жанчынамі. Іх жыццё, здаецца, цячэ спакойна, не імчыцца наўзлом галавы, аднак жа гэта паўнаводнае цячэнне ў рэчышчы маральнай чысціні:

Пачуеш вас, не зманеных маной,
І весялей глядзіш у твар эпохі.
Дык пасядзіце ж, любыя, са мной,
Пагаманіце, пагукайце трохі.

Пагукайце тут значыць—паспявайце. Тэма песні і мовы, тэма радзімы—знаёмыя скразныя плыні ў паэзіі Ніла Гілевіча. Трэба сказаць, што ў «Актавах»

мы не адчуваем перапеваў. Тэмы гэтыя ачысціліся ад публіцыстычных перадзержак, узняліся да філасофскай медытацыйнасці:

Страціў слова, страціў спадчыннае слова—
Штосьці страціў у душы абавязкова!
Можа—годнасці хоць кропельку малую?
Можа—мудрасці хоць дробачку якую?

Намякаючы ў другой частцы верша пра мажлівую страту памяці і праўды, паэт так і не адказаў канкрэтна, што траціць чалавек разам з роднай мовай. Ён адаслаў няшчасных ці вінаватых па адказы да іх маці, і гэты ход надаў паэтычнаму дыялогу загадкавасць і змястоўнасць недасказанасці. Роздумна вядзе паэт і тэму песні, той песні, якой мова дае жыццёвую праўду, а ўзамен набывае цудоўную сілу ўзрушэння.

Сярод актаў, прысвечаных гэтай тэме, мне асабліва спадабалася «Балгарская песня». Гэта не проста стылізацыя пад любоўныя песні, а арыгінальны твор, у якім цераз набліжэнне да народнай паэтыкі аўтар змог сцвердзіць вітальную роднасць лёсу чалавека са светам прыроды. Псіхалагічны паралелізм ён ператварыў у глыбокую асацыяцыю, поўную філасофскага роздуму над непадуладнымі волі чалавечай паваротамі долі і ўдарамі жыцця:

Чарней, чарней, сястра мая дуброванька,
Абое мы напроць зімы ўчарнелі:
Ты па сваім лісці, сястра дуброванька,
А я па лецейках, што адшумелі.
Тваё лісцё, сястра мая дуброванька,
Зазелянее зноўку на раздоллі.
А мае лецейкі, сястра дуброванька,
Ўжо да мяне не вернуцца ніколі.

Песня гэта ўспрымаецца ў кантэксце тых вершаў, дзе паэт ажыўляе балючую памяць вайны і незабыўных страт нашага народа. У кантэксце сучаснасці прыглушаецца народна-традыцыйны элемент у вобразнай структуры, традыцыйнае падпарадкоўваецца надзённаму.

Чысціня, бескарыслівасць і хараство чалавечых адносін, мудрасць народнай маралі... Ці дастаткова высока цэнім і пільна беражом гэтыя скарбы мы, людзі эпохі тэхнічных цудаў? Скразное пытанне хвалюе паэта. Вось ён глядзіць тэлевізар:

Сядзі сабе ў цяпле, між родных сцен,
Як вязень, сам сабою пакараны,
Гадай пра сэнс пачутых перамен,
Перажывай краін далёкіх драмы...
Табе зрабіўся блізкім цэлы свет!
А ці бліжэйшым стаў табе сусед?

Калі ж тэхнічныя вынаходніцтвы становяцца паўнацэннымі сродкамі гуманістычнага прагрэсу? Тады, калі навукова-тэхнічная рэвалюцыя ідзе ў пары з рэвалюцыяй сацыяльнай. У сацыялістычнай рэвалюцыі, яе разгортванні і развіцці—гарантыя здаровага маральнага абнаўлення свету. Пачуццё годнасці за сваю Радзіму, за яе рэвалюцыйныя традыцыі гучыць у вершах Гілевіча на ўвесь голас. Пачуццё годнасці спалучаецца ў яго з высокай патрабавальнасцю да сябе і сучаснікаў, савецкіх людзей, ад якіх свет чакае ўзораў духоўнага багацця. У лепшых творах Гілевічу ўдаецца пераадолець бар'ер дэкларацыйнасці і не ўпадаць у рыторыку, бо прызнанні ў любові і клятвы вернасці Радзіме дае чалавек, у чыю паважнасць і прынцыповасць мы паверылі. І яго падсцерагаюць памылкі, але ён умее не толькі прызнаваць іх, але сам сябе караць шчыра і сурова.

Праблематыка першага грамадзянскага раздзела «Актаваў», напэўна, магла б укласціся ў тэматычныя межы сучаснай беларускай паэзіі, пазначаныя вядучымі яе майстрамі. Адметнасць Ніла Гілевіча ў тым, што ён нясе ў сабе і

ўмее перадаць адчуванне нейкай пачцівай гаспадарскай рупнасці і сумленнасці ў падыходзе да вострых праблем сучаснасці. Пераходы ад інтэлектуальнасці да канкрэтных праяў жыцця, праверка прынцыпаў практыкай чалавечых адносін — вось што спараджае эстэтычную актыўнасць успрымання. Для прыкладу прыгадаем:

І жэніцца і родзіць вёска слаба.
Гісторык з часам знойдзе веку штрых:
У кожнай хаце — толькі дзед ды баба,
У кожным класе — толькі сем малых.
А помніцца: на школьны пляц-падворак
З адной сям'і нас бегла семярых...
Ці зразумее будучы гісторык,
Як мне ўпіваўся ў сэрца «веку штрых»?

Клопат і роздум пра жыццё, пра дасканаленне міжчалавечых зносін прадыктавалі план зборніка. Самы вялікі першы раздзел кніжкі прысвечаны грамадскай сферы, другі і трэці — адносінам асабістым. Паэт славіць тут творчае пабрацімства з паэтамі Балгарыі як цудоўную праяву мужчынскай дружбы. Фактычна гэты раздзел — цыкл, напісаны ў форме запрашэнняў у госці найбольш блізкіх аўтару балгарскіх сяброў. Гілевіч пацвердзіў тут сваё прызнанае ўмельства весці ўрачыста-велічальныя маналогі, не збіваючыся на манатонную пустату.

Наогул, тэматычныя раздзелы атрымаліся ў Гілевіча даволі ўмоўнымі, бо творам яго ўласціва шматтэмнасць. Любоўная лірыка, напрыклад, моцна афарбавана знаёмаю ўжо нам па грамадзянскіх актавах маральна-этычнаю або эстэтычнаю праблематыкай.

Самы кароткі і, на жаль, самы слабы ў кніжцы — апошні раздзел: васьмірадкоў'і сатырычныя. Апрананне ў тую ж васьмірадковую кашулю высокага і смешнага, як мне здаецца, нават дыскрэдытуе форму актавы, ператварае яе ў бутэльку з-пад выпітага віна, куды налілі добра калі воцату. За выключэннем апошняга верша пра Каралішчавіцкі Дом творчасці, дзе смяшынка толькі падфарбоўвае сур'ёзнае, творы гэтага раздзела ў кніжцы выглядаюць чужароднымі. Толькі вершы элегічна-роздумнага і медытацыйнага гучання прыдатны на васьмірадковую кампазіцыю. Яна іх аб'ядноўвае, дакладней, падкрэслівае ідэйна-эстэтычную еднасць. Кампазіцыя гэтая вельмі строгая, яна патрабуе такой чысціні радка і вобраза, якія дасягаюцца толькі ў часе найвышэйшай натхнёнасці.

«Актавы» Н. Гілевіча — творы пераважна медытацыйнай лірыкі, падказаныя ўстаноўкаю на лаканічнае выяўленне роздуму над сутнасцю сучаснага жыцця і чалавека. У больш удалых творах, такіх, як «Летняй ночкай, чуйнаю, як звон», «Цераз зараснік інею ў ранішнім лесе», «Бомы жаўранкаў у звечарэлым полі», «Не гаманіце, вербы, не будзіце» і інш., паэт здолеў дасягнуць хвалюючай глыбіні роздуму над увасобленымі з'явамі прыроды. Так, роздум пра неймаверную далікатнасць хараства і эстэтычнага ўспрымання свету чалавекам абудзіў у яго ўспамін пра зімовую шэрань, што ападае ад самага далікатнага дотыку сонечнага промня:

Цераз зараснік інею ў ранішнім лесе
Прабіраецца сонца — ціхусенька так,
Затаіўшы дыханне: хаця б не атрэсці
Гэты цуд, што стварыў найвялікшы мастак.

І ўсё ж нейкую нітачку дзесь зачапіла:
Скалыхнулася голка — пыл срэбны курыць...
Ну і ну! Нават дотыку промня хапіла,
Каб, парушыўшы чары, красу разбурыць!

Верш кранае думку, наводзіць на ўспаміны, а канкрэтнае жыццёвае запаўненне тэмы — справа духоўнай актыўнасці чытача, яго здольнасці прыгадваць і нанова асэнсоўваць у зададзеным элегіяй настраёвым ключы асабіста перажытыя аналагічныя здарэнні, паглыбляць іх унутранае бачанне, разуменне. Паэт шчасліва знайшоў тут меру вобраза. Здаецца, калі б ён дадаў хоць адзін троп, хоць адзін

радок ці нават слова, дык гэтая мера была б парушана, аўтар ад заахвочвання чытача прыняць тэму медытацыі перайшоў бы да навязвання яму сваіх жыццёвых прыкладаў і мог бы пусціць яго ўяўленні па прамой канве дыдактыкі.

Мне могуць запярэчыць, што лаканічная форма васьмірадковіка сама сабою не дае паэту загаварыцца, упасці ў грэх шматслоўнасці і павучальнасці. Натуральна, у кароткіх лірычных кампазіцыях адбор жыццёвага матэрыялу асабліва строгі, сюды не ўціснецца, напрыклад, біяграфія душы героя. Аднак жа небяспека «перабору», выдаткі празмернай «яснасці» і шматслоўнасці маналогу стаяць у гэтых мініяцюрных структурах выключна востра, бо адно слабое чатырохрадкоўе азначае тут баласт, роўны палавіне ўсёй кампазіцыі.

Паэт прызнаецца:

Мне дождж і холад збрыдзелі даўно:
Нідзе не выйсці—скрозь цячэ і цэдзіцца.
Гляджу на шлях, а мутнае акно—
Ці ты, ці не?—мне не дае прыгледзецца.

Сказана хораша, тонка перададзены настрой чакання і «крыўды» закаханага на непагадзь, якая стала лірычнай мішэнню, што прыняла на сябе «віну» дзяўчыны і прыкрыла замглёнаю шыбай слязу ў юнака. Як і ў папярэдняй элегіі, чытач атрымлівае тут адзін ключавы акорд і танальнасць песні, якую павінна скласці і праспяваць яго душа, калі яна здольна спяваць, калі ў ёй маецца жыццёвы матэрыял, з якога складаюць песні. Закончанасць прыведзеных радкоў мініяцюры з'яўляецца ў гэтым канкрэтным выпадку прыкметай кампазіцыйнага хібу, бо, акрамя прыведзенага кампанента, у актаву ўваходзіць яшчэ адзін—лішні. Чытаючы яго, адчуваеш, як паэт браў разгон, але ў такіх мініяцюрных кампазіцыях разгон супрацьпаказаны, тут трэба пускацца з месца ў кар'ер. Такім чынам, паэт парушыў законы жанру: усё аказваецца неабавязковым у першай «разгоннай» паўстрафе.

Маленькі пташачак, як верабей,
На дождж і холад зноў варожыць з вечара.
І я не рад ягонай варажбе
У шыгаллі старой сасны знявечанай.

Не цяжка здагадацца, што тут зафіксаваны той жыццёвы факт, які даў імпульс паэтычнаму перажыванню. Мабыць, паэт сапраўды бачыў і чуў тое, што тут намаляваў—старую сасну і свіргатанне птушак, якія зашываліся ў яе густую крону ад непагадзі. Жыццёвыя ўражанні мелі для яго значэнне. Але не яны сталі тэмай твора. Тэмай сталі пачуцці, што з'явіліся на наступны дзень, дажджлівы дзень дарэмнага чакання. Паэт жа даў нам не толькі тэму, але і яе дагісторыю. Даў лішняе, тое, што павінна было застацца за рамкамі мініяцюрнай кампазіцыі.

Ніл Гілевіч настойліва шукае змястоўнасці і дзейнасці, але, як мне здаецца, найбольш цяжкасцяў трапляецца яму пры адборы вобразаў-нарыхтовак. Праблема меры, бязлітаснае адкіданне ўсяго лішняга, неабавязковага, смелае апусканне неабавязковых звёнаў-мосцікаў у паэтычным выказванні, перавод часткі зместу ў падтэкст дзеля абуджэння творчай актыўнасці чытача, які заўжды павінен станавіцца саўдзельнікам у творчай рабоце—вось пажаданне, якое нярэдка ўзнікае пры аналізе твораў Ніла Гілевіча. Абрэзванне галін, якія, можа, і не лішнія на дрэве, але і не абавязковыя, з'яўляецца ўмовай таго, каб разрасталася і зелянілася крона мастацкага дрэва ў думках і ва ўяўленнях чытача.

Уладзімір КАЛЕСНІК